# ДЗЯКУЙ, ДЗЯДЗЬКА РЫГОР

**Ці задумваліся вы, чаму творы Рыгора Барадуліна так падабаюцца і малым, і дарослым? Падчас сустрэчы, прысвечанай 85-годдзю паэта, што прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, школьнікі з розных куткоў нашай краіны дзяліліся сваімі ўражаннямі, звязанымі з вершамі класіка.**




**Дзеці стварылі плакаты і цытавалі класіка.**

— Хачу выказаць шчырую падзяку дзядзьку Рыгору, што звяртаў нашу ўвагу на сапраўдныя жыццёвыя каштоўнасці, якія вучаць чалавека паважаць сябе і іншых, быць інтэлегентным, кахаць і верыць сапраўды, а не напаказ, — заўважыла Марыя Царова. Яна ўпэўнена, што ў час гаджэтаў і пагоні за «лайкамі», ісціны, пададзеныя ў вершах класіка, становяцца актуальныя як ніколі.

Марыя — адна з удзельнікаў творчага конкурсу, арганізаванага Нацыянальнай бібліятэкай. Супрацоўнікі галоўнай кніжнай скарбніцы заўважылі, што на творах Рыгора Барадуліна можна выхоўваць дзетак, што цытаты з яго вершаў здольныя пераварочваць свядомасць, абуджаць маленькіх чытачоў да ўсведамлення важных пытанняў, пошуку сэнсаў чалавечага жыцця. Яны прапанавалі школьнікам выбраць любімыя радкі з вершаў класіка і паразважаць на тэмы, якія закрануў паэт. І на такую прапанову адгукнуліся вучні з усёй краіны.

Так, на свята «Барадулін у нашых сэрцах» сабраліся школьнікі з Мінска, Брэста Магілёва, Пастаў, Рэчыцы, Баранавіцкага раёна. Аказалася, што сучасных дзяцей многія вершы класіка клічуць да дыялогу. Дзеці асэнсоўваюць думкі дзядзькі Рыгора і разумеюць, што ён пакінуў ім у спадчыну адказы на вельмі многія хвалюючыя пытанні.

Марыя Каралёва ў вершах класіка шукала адказы на тэму «што такое каханне», Тэрэза Баранава з вёскі Застарынне Баранавіцкага раёна пісала эсэ, на якое яе натхніла цытата з верша Барадуліна «Родны край ніхто не выбірае, выбірае родны край цябе». А яе сяброўку Арыну Нахват зачапіла тэма вайны, дзяўчынка разважала над радкамі паэта «П'е чалавечую кроў, харчуецца людствам вайна».

Была даслана на конкурс і адна вершаваная работа — такую форму для свайго эсэ абраў Ілья Талстыка з вёскі Вялікая Сваротва Баранавіцкага раёна. Хто ведае, можа з гэтага адкрытага хлопчыка, сэрца якога адгукнулася на вершаваныя запаветы Рыгора Барадуліна, таксама вырасце цудоўны паэт. Усё ж дзядзька Рыгор даў літаратурную пуцёўку ў жыццё не аднаму пісьменніку.

На сустрэчу ў Нацыянальную бібліятэку завіталі сябры Рыгора Барадуліна. Пазнаёміцца з юнымі аматарамі творчасці пісьменніка прыехала і яго ўдава. Валянціна Міхайлаўна прызналася: «З Рыгорам было весела жыць. А цяпер сумна. Не стала і маёй адзінай дачкі, пасыходзілі ўжо яго сябры, і сёння мой адзіны суразмоўца — стары руды кот. Вялікі дзякуй, што вы сабраліся ўспомніць майго Рыгора, ён быў бы дужа шчаслівы». Менавіта такія сустрэчы дазваляюць зразумець, што Рыгор Барадулін застаецца з намі. У нашых сэрцах, нашых думках, нашых марах.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота аўтара.**